**Каранеўская А.М. (Мінск)**

# Загаловак як сродак перадачы дзеяння асобы ў апавяданнях першай трэці ХХ стагоддзя

Дзеянне ў творы з’яўляецца адным з найважнейшых элементаў псіхалагічнага зместу мастацкага вобраза ў літаратурным творы. Вельмі часта дзеяннем лічыцца канкрэтны ўчынак і рух, жэст ці смех. А.П. Матруненак прапануе больш шырокае разуменне дзеяння. Даследчык тлумачыць, што “чалавек дзейнічае ў знешнім плане (рухі, жэсты, выказванне думак і г.д.) і ва ўнутраным (перажывае, успамінае, абдумвае)” [4, с. 33].

З’яўляючыся кампанентам тэксту, загаловак аказваецца злучаным з тэкстам даволі складанымі адносінамі ўзаемазалежнасці. З аднаго боку, “загаловак у пэўнай меры прадвызначае змест тэксту”, з іншага – “сам вызначаецца ім, развіваецца, узбагачаецца па меры разгортвання тэксту” [6, с. 128]. Адны загалоўкі выяўляюць задуму пісьменніка, сэнс іншых раскрываецца толькі пасля прачытання твора. І як бы ні суадносіўся загаловак са зместам твора, ён заўжды вылучае, акцэнтуе ў творы нешта галоўнае, з першага погляду, магчыма, і незаўважнае, гэта можа быць ідэя ці настрой пісьменніка. З прычыны сваёй вылучанасці з асноўнага тэксту загаловак займае самую моцную пазіцыю ў мастацкім творы. Таму ён з’яўляецца “сэнсавай, кампазіцыйнай і эмацыянальнай дамінантай усяго мастацкага твора, якая раскрывае значэнне, танальнасць і будову кожнай яго часткі” [3, с. 3].

Асаблівай увагі заслугоўваюць загалоўкі, якія адлюстроўваюць розную якасць дзеяння асобы: канкрэтнае дзеянне (“Зарабляюць” Ядвігіна Ш., “Дачакаўся” Я. Коласа, “Абмылілася” П. Галавача, “Еду дамоў” М. Гарэцкага), актыўнае дзеянне (“Атамсціў” А. Бабарэкі, “Злавіў” Я. Коласа, “Даказаў” С. Баранавых). Мастацкая вартасць апавядання П. Галавача “Абмылілася” канцэнтруецца на псіхалагічнай дэтэрмінаванасці ўчынкаў галоўных герояў, дзеянні і рысы характару якіх матываваліся сацыяльнымі фактарамі. Ліда, галоўная гераіня твора, “сядзела ў багне мяшчанства”, аднак яе душа імкнулася да ўсяго новага, прагнула ідэалу, дзяўчына марыла пра сустрэчу з сапраўднымі людзьмі. Расчараванне ў каханні да маладога рабочага-партыйца Капцюра, у няспраўджаным ідэале даводзіць даверлівую Ліду да самагубства. Капцюр паказаны ў апавяданні маральна-разбэшчанай асобай, драпежнікам па натуры. Праз удалы вобраз маладой гараджанкі П. Галавач псіхалагічна пераканальна паказвае, што прычына трагічнай памылкі дзяўчыны ў яе маладосці, шчырасці, жыццёвай неспрактыкаванасці. Загаловак дадзенага апавядання, такім чынам, фарміруе чытацкае ўспрыняцце

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

твора і накіроўвае ўвагу чытача на пэўны вынік дзеяння – “абмылку” галоўнага героя.

Загалоўкі мастацкіх твораў таксама могуць перадаваць пэўны працэс, фізічны і/ці душэўны стан (“Не памёр: нарадзіўся” К. Сваяка, “Амаладзіўся”, “Перарадзіўся” М. Нікановіча, “Не пашанцавала” С. Баранавых), настрой і перажыванні персанажаў (“Хачу жаніцца, баюся, каб не спазніцца” І. Барашка, “Называецца зарабіў” Я. Коласа, “Не вытрываў” Л. Родзевіча, “Будзем жыць” К. Чорнага). Да таго ж яны раскрываюць эмацыянальную і душэўную ўзрушанасць герояў, выяўляюць напружанасць моманту: “Выстагнаўся” Я. Коласа, “Адпомсціў” Ц. Гартнага, “Будзем жыць”, К. Чорнага. Асобныя загалоўкі непасрэдна або ўскосна ўказваюць на суб’ект дзеяння: “Адплаціў” М. Нікановіча, “Зарабіў” С. Хурсіка, “Мінулае ўспомніў” Ф. Шантыра.

Дзякуючы выкарыстанню дзеясловаў у якасці загалоўкаў, аўтары вызначаюць сэнсава-эмацыянальную дамінанту твора або канцэпцыю вобраза героя. Дзеясловы-назвы дапамагаюць стварыць эфект дынамізму, драматызацыі дзеяння, зменлівасці часу і падзей, ажывіць сюжэт увогуле. Так, апавяданне М. Гарэцкага “Паехалі” пачынаецца матывацыяй “на энергію, на перадачу пульсуючай радасці, што выпраменьваецца з сэрца ад маючай адбыцца сустрэчы апавядальніка з новым краем, з новымі звычаямі, не бачанай да гэтага прыродай, з невядомымі людзьмі” [5, с. 165]. Але адразу ж гэтыя светлыя мары і спадзяванні змяняюцца на рэальна ўбачанае: беднасць, шэрасць, аднастайнасць, убоства, бо ніякія рэвалюцыі не памянялі бяду на радасць, а беднасць і жабрацтва – на заможнасць. “Адзінота, туга, сум, галеча – вось апорныя сігналы апавядання, «балючыя кропкі» яго пафасу” [5, с. 165]. Дзеяслоў, уключаны ў загаловак, “гаворыць”, а значыць – дзейнічае. Ён дзейны і дзейсны, “дынамізуе” апавяданне, прыводзіць у рух вобразы, сцэны жыцця, эпізоды і думкі.

У загалоўку могуць быць выяўлены матывы штодзённага ходу жыцця і яго падзей, дзейнасці героя (і ўвогуле руху), якія апярэджваюць дынаміку твора. Яны могуць і прадвызначаць падзеі, і раскрываць іх сэнс і значэнне. У гэтых адносінах загалоўкі могуць мець самыя розныя варыянты (“Адплаціў” М. Нікановіча, “Жылі-былі” Л. Андрэева).

Напрыклад, у апавяданні “Дойдзем, сынок” Ц. Гартнага “праўдзіва паказаны жудасныя рэаліі разбурэння, тыя маральныя і фізічныя пакуты, якія давялося перажыць людзям у час грамадзянскай вайны і акупацыі Беларусі белапалякамі” [2, с. 364]. Гераіня апавядання вымушана разам з сынам пакінуць роднае мястэчка, якое вось-вось займуць акупанты. Дома заставаца небяспечна, бо муж яе на фронце ваюе з палякамі. Спыніўшыся, каб

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

перадыхнуць, жанчына з болем у сэрцы думае, гледзячы на спелае жыта: “Колькі хлеба! Які ўраджай у гэтым годзе! Нівы і нівы – бясконца! Спакойнае, стомленае ад цяжару, жыта міла ўсміхаецца тваім вачам. А там ужо, глядзі, і жніво пачалося… Жнуць і пяюць… А вечарам пойдуць дахаты, шчаслівыя, задаволеныя ўраджаем… А я? Што я буду ў гэты год жаць?” [2, с. 364]. Праз загаловак аўтар адкрыта дэкларуе галоўную мэту гераіні – дайсці да таго месца, да новага кутка, дзе будзе каласіцца жыта, што выклікае неспатольную прагу да жыцця.

Змест некаторых твораў, якія разлічаны на развіццё характараў, можа арыентаваць на перадачу ўчынкаў і выяўленне актыўнай дзейнасці. Гэта перш за ўсё ўласціва такім апавяданням, як “Выстагнаўся” і “Адгукнуўся” Я. Коласа. З глыбокім спачуваннем расказваючы аб нялёгкім жыцці Івана Кісяля, героя апавядання “Выстагнаўся”, пісьменнік не бачыць прычын для песімізму, а наадварот, ён сімпатызуе людзям працы, і гумар гучыць надзвычай добразычліва. Аповед вядзецца ў лёгкай жартаўлівай манеры, камічнае ў творы выяўляецца і ў асаблівасці сітуацыі, і ў характары аўтарскіх адносін да героя, у сістэме вобразна-паэтычных сродкаў. Герой твора ўсё жыццё вымушаны стрымліваць слёзы, няглядзячы на горыч незлічоных крыўд, якія ён церпіць з самага маленства. Варта было яму ў дзяцінстве толькі скрывіць губы, – ужо маці знімала хвартух, і мабілізавала паскі на Іванаву спіну – “не смей плакаць!”. Іван уцякаў на бераг ракі, каб там, удалечыні ад людзей, “выстагнацца” ўволю, але і тут яго чакала няўдача: з-за кустоў паказвалася галава рыбака. “Гэта ты прыйшоў пужаць мне рыбу, злодзей ты?! Я табе паскавычу” [1, с. 71]. Канцоўка твора перадае дзеянне героя ў двух ракурсах: псіхалагічным і фізічным – унутраны маналог героя аб смерці і ўзаемаадносінах з каханай дзяўчынай прыпадобнены стогну ў песні “Сонца ўсходзіць і заходзіць”. Аўтар такім чынам не адасабляе знешняе дзеянне ад дзеяння ўнутранага, ад таго, што называецца дзеяннем-думкай, дзеяннем-перажываннем, дзеяннем-інтуіцыяй.

Часам дэкларатыўны загаловак уступае ў дысананс з літаратурным тэкстаМ. Так, на думку М. Мішчанчука, ў шэрагу ранніх апавяданняў К. Чорны выдае рэальнае за магчымае. “Многае ён недабачваў, недачуваў. Ці балела яго сэрца, калі ў барацьбе за новае перакрэсліваў старое? Ці клапаціўся мастак пра лаканічнае развіццё характараў, перадачу натуральных паводзін герояў? Не. Таму часам яго персанажы вымаўляюць гучнае «Будзем жыць» (аднайменнае апавяданне) у валасным савеце пры атрыманні абвесткі пра смерць сына на вайне, калі сэрца павінна камянець і слёзы застываць на вачах. Таму, бывае, ператвараюцца яны ў аратараў, агітатараў за цьмяную

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

праўду, двайнікоў аўтара. Ён не заўважае ўнутранага драматызму барацьбы Святла і Цемры, Старога і Новага, іх дыялектычнай сувязі” [5, с. 98].

Такім чынам, загалоўкі могуць выконваць функцыю падмурка складанай мастацкай будовы, выступаючы адначасова і арганічнай часткай, іменем мастацкага твора, і індывідуальна-аўтарскім выказваннем аб творы. На падставе аналізу дзеяння ў разглядаемых творах можна зрабіць выснову, што праз узаемаўплыў і ўзаемаабумоўленасць знешняга і ўнутранага дзеяння ў загалоўку і ў самім творы, праз дзеянне асобы аўтар можа адзначаць пэўныя рысы характараў герояў, або вызначаць сэнсава-эмацыянальную дамінанту твора.

Літаратура


1. Гальмакоў, Д.І. Стыль прозы Якуба Коласа / Д.І. Гальмакоў. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1983. – 224 с.

2. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 1 : 1901–1920. – 583 с.

3. Кожина, Н.А. Заглавие художественного произведения : структура, функции, типология (на материале русской прозы XIX–XX в.) : автореф. дис. ... канд. филолог. наук : 10.02.01 / Н.А. Кожина ; АН СССР Институт русского языка. – Москва, 1986. – 22 с.

4. Манкевіч, А.А. Праз прызму жыцця: стылёва-жанравыя асаблівасці апавяданняў Якуба Коласа / А.А. Манкевіч. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 127 с.

5. Мішчанчук, М.І. Беларуская літаратура ХХ ст. : вучэб. дапам. / М.І. Мішчанчук, І.С. Шпакоўскі. – Мінск : Выш. шк., 2001. – 352 с.

6. Шур, В.В. Онім у мастацкім тэксце : манаграфія / В.В. Шур. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2006. – 216 с


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ